# ЧАС ПАКАЗАЎ, ШТО РОБІМ ПРАВІЛЬНА



**Учора ў Палацы Незалежнасці з удзелам Прэзідэнта абмяркоўвалі шмат тэм: развіццё Віцебшчыны і пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС раёнаў Гомельшчыны, маючыя адбыцца нарады з урадам, Нацбанкам і Адміністрацыяй Прэзідэнта, працоўных мігрантаў... Кіраўнік дзяржавы, як заўсёды, быў катэгарычны і шчыры па ўсіх пытаннях.**

(Працяг на стар. 2–4)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 КРАСАВІКА 2025 г. СУБОТА № 82 (30470)



У брэсцкі кінатэатр «Беларусь» з усіх бакоў ішлі хлопцы і дзяўчаты. Прыходзілі нярэдка амаль цэлымі класамі, групамі невялікімі і большымі, часам — па двое-трое. Памяшканне другога паверха кінатэатра на тры дні аддадзена пад маладзёжны кірмаш вакансій.

СТАР. 10



Фота носіць ілюстрацыйны характар. З архіва БелТа

# І ЗАРАБІЦЬ, І НАВУЧЫЦЦА

**На маладзёжным кірмашы вакансій у Брэсце ёсць прапановы для людзей розных узростаў**

ГІСТОРЫЯ АДНОЙ ПРАПАНОВЫ 15



З НАГОДЫ

# НАДЗЕЙНАЯ СПРАВА

**У Клімавіцкім раёне будуюць новыя вытворчасці і ствараюць працоўныя месцы**

Некалькі гадоў таму ў Клімавіцкім раёне быў уведзены ў строй самы буйны ў рэгіёне свінагадоўчы рэпрадуктар. Цалкам сучасная, аўтаматызаваная, высокатэхналагічная вытворчасць стала адным з важкіх укладаў дзяржавы ў развіццё паўднёва-ўсходняга рэгіёна, які сур'ёзна пацярпеў ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Радыяцыя адступае, і жыццё на калісьці забруджаных чорным попелам землях адраджаецца.

СТАР. 11



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

25082>

9 771990 763008

# «ЧАС ПАКАЗАЎ, ШТО МЫ ДЗЕЙНІЧАЛІ

## Якой увагі патрабуюць цяпер пацярпелыя

«Рэгіянальны» тыдзень Аляксандра Лукашэнкі працягваецца. У пятніцу ён працаваў у Палацы Незалежнасці, але ўсё роўна ўвага была прысвечана рэгіёнам. На ўзроўні кіраўніка дзяржавы абмеркавалі аднаўленне і развіццё раёнаў Гомельскай вобласці, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцы.



Фота БелТА.

У цэнтры ўвагі прысутных — меры падтрымкі, экалагічныя праграмы і сацыяльна-эканамічныя ініцыятывы для жыхароў тэрыторый Гомельскай вобласці, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

### «ЗРАЗУМЕЛІ, ШТО ІНШАЙ КРАІНЫ Ў НАС НЕ БУДЗЕ»

**«Я часта кажу, што гэту станцыю мы не будавалі, мы яе не эксплуатавалі і, натуральна, мы яе не падрывалі. Але бяда закранула Беларусь і беларускі народ больш, чым каго-небудзь», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.**

Ён нагадаў, што першыя 10 гадоў пасля аварыі былі поўныя нявызначанасці, нагнятання страхаў: «Будучы яшчэ дэпутатам, я выязджаў у гэтыя раёны, цікавіўся, што там адбывалася. 10 гадоў блытаніны, кагосьці адсялялі, перасялялі, нешта будавалі, рабілі... Потым мы апамяталіся, узяліся за галаву і зразумелі, што для беларусаў іншай зямлі не будзе і іншай краіны таксама не будзе, і трэба думаць, як жыць у Беларусі, у тым ліку і на гэтых землях».

У краіне быў прыняты шэраг праграм, якія назвалі «чарнобыльскімі». «Я тады яшчэ пра гэта казаў, 30 гадоў таму, што пройдзе час, ён усё расставіць на свае месцы, і мы зразумеем, правільна рабілі ці не. Сёння мы можам зрабіць пэўныя высновы: калі б мы гэтай праблемай не займаліся, а яшчэ горш — займаліся б так, як першыя 10 гадоў, то Беларусь увогуле ўжо б не існавала, усе б кудысьці пабеглі, разбегліся і гэтак далей. Я не папракаю тых, хто рабіў першыя крокі па пераадоленні Чарнобыльскай катастрофы. Абсалютна. Бо мы не ведалі ўздзеяння малых доз радыяцыі на арганізм чалавека. Мы не ведалі, што гэта такое. Калі Хірасіма і Нагасакі — гэта выбух атамнай бомбы, і там велізарная маса ўсіх наступстваў: і ўдарная хваля, і тэмпература, і радыеактыўнае заражэнне вялікімі дозамі — мы разумелі, досвед ужо нейкі быў у чалавецтва. Тут — не. Рабілі, каб не было горш, — звярнуў увагу Прэзідэнт.

**— Мы пайшлі сваім шляхам, ніхто нам пасля распаду Савецкага саюза ніякай дапамогі не аказваў».**

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў «чарнобыльскія» праграмы былі ўкладзены вельмі вялікія грошы — толькі за апошнія 10 гадоў каля 5 мільярдаў рублёў. І зроблена ў гэтым кірунку гэтак жа нямала.

**«Часам мы рабілі непапулярныя крокі, не раздавалі па рублі, як гэта было прынята ці як хтосьці хацеў, гэтыя грошы, а канцэнтравалі на тых праектах, якія патрэбны былі для людзей: жыллё, чыстая вада, каналізацыя, водаадвядзенне, газіфікацыя і гэтак далей. Вельмі шмат было зроблена за мінулы час. І ён паказаў: мы дзейнічалі абсалютна дакладна і правільна», — акцэнтаваў кіраўнік дзяржавы.**

### «БУДЗЕ ПРАДМЕТНАЯ РАЗМОВА»

Прэзідэнт адзначыў, што гэта размова — не падвядзенне вынікаў. Ён расказаў, што планує асабіста наведаць чарнобыльскія раёны. І напярэдадні гэтых паездак важна правесці аналіз сітуацыі, разгледзець, ці патрэбна дапамога тым раёнам (перш за ўсё ў Гомельскай вобласці).

**Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: дапамога будзе аказана там, дзе яна сапраўды патрэбна, грошы будуць выдзяляцца пад канкрэтныя праекты. Паводле яго слоў, трэба адвучаць усходнія рэгіёны ад пастаяннай падтрымкі. «Трэба жыць па сродках і зарабляць грошы самім», — канстатаваў Прэзідэнт.**

Ён заўважыў, што на гэту тэму яшчэ будзе прадметная размова. І пачнецца яна з Віцебскай вобласці, дзе таксама шмат праблем.

«У нас хапае на захадзе праблем, але не столькі, колькі на ўсходзе. Разбасячыліся — далей няма куды. Я вось пабываў у Віцебскай вобласці. Дзе б я ні быў, даручыў: давайце сур'ёзна праверым пасля маёй паездкі. Куча пытанняў», — заявіў Прэзідэнт на злобу дня. Свежы прыклад — сыраробная вытворчасць, якую Прэзідэнт наведаў у Копысі. Ён расказаў пра «жуліковатыя схемы» на прадпрыемстве: малако замест таго, каб перапрацоўваць, там прадавалі. Прэзідэнт таксама выказаўся крытычна наконт вялікіх паказчыкаў па падзяжы жывёлы. Прынамсі, гэта актуальна як для Віцебскай, так і для Гомельскай абласцей. «І яны мне расказваюць: «Вы ведаеце, Аляксандр Рыгоравіч, вы не хвалюйцеся, выраўняем». Слухайце, я вясковы мужык, працаваў у сельскай гаспадарцы. Я не разумею: калі цяля здохла, як можна яго выраўняць? Мне ж не паказчыкі, Іван Іванавіч, патрэбны. Мне патрэбна жывая жывёла. Таму што цяля — гэта будучая карова ці будучы бычок, які пойдзе на адкорм. А значыць, гэта малако і ялавічына», — абурыўся кіраўнік дзяржавы.

### БУДЗЕМ КРОК ЗА КРОКАМ АСВОЙВАЦЬ ТЫЯ ТЭРЫТОРЫІ

Упаўнаважаны Прэзідэнта па Гомельскай вобласці, намеснік Прэм'ер-міністра Анатоль Сівак далажыў, што на пачатак 2025 года ў зонах радыеактыўнага забруджвання размешчана 2016 населеных пунктаў (яны закранаюць пяць абласцей краіны), дзе пражываюць больш як 930 тысяч чалавек, у тым ліку 181 тысяча дзяцей да 17 гадоў. Аляксандр Лукашэнка на гэта адрэагаваў крытычна. «Чым жа мы тады займаліся 30 гадоў, калі ў нас 900 тысяч пражываюць на забруджаных тэрыторыях?» — спытаў ён.

**Кіраўнік дзяржавы даручыў сур'ёзна прааналізаваць пытанні аднясення тэрыторый да катэгорыі пацярпелых або забруджаных і вырашыць, наколькі гэта мэтазгодна. Прэзідэнт нагадаў, што шмат разоў асабіста бываў у тых месцах, і кожны раз гаварыў аб тым, што трэба вяртаць у сельгасабарот землі, максімальна, наколькі гэта магчыма.**

«Вы павінны падказаць. Крыўдзіць людзей не трэба. На забруджанай тэрыторыі ў нас ніхто жыць не павінен», — падкрэсліў беларускі лідар. Тым больш што ў краіне ёсць вопыт адраджэння пацярпелых тэрыторый, аднаўлення на іх сельскагаспадарчай дзейнасці. «Вось гэта дынаміка мне патрэбна — што мы зрабілі за гэты час, — паставіў задачу Прэзідэнт. — Трэба навесці парадак».

**Пры гэтым ён звярнуў увагу, што землі, дзе пакуль нельга жыць, лепш не чапаць, каб пабярагчы людзей. Але калі небяспека мінула і тэрыторыя ўжо бяспечная, значыць, трэба ёй займацца, асвойваць. «Будзем рабіць гэта ціхенька, крок за крокам, асвойваючы тыя ці іншыя землі. Але толькі калі мы будзем упэўнены, што гэта нармальна», — заявіў Прэзідэнт.**

Анатоль Сівак падкрэсліў, што пытанне крытэрыяў аднясення зямель да катэгорыі забруджаных патрабуе дадатковай дэталёвай прапрацоўкі. Ён запэўніў: на ўзроўні ўрада гэтаму будзе ўдзелена асаблівая ўвага.

# АБСАЛЮТНА ДАКЛАДНА І ПРАВІЛЬНА»

## ад чарнобыльскай аварыі тэрыторыі

**У тэму**

### Канцэнтрацыя, дысцыпліна, эфектыўнасць

Пра вынікі прадметнай размовы ў Прэзідэнта журналістам расказалі адказныя асобы. Галоўны вынік у тым, што падтрымка чарнобыльскіх рэгіёнаў у краіне захаваецца. Аб гэтым расказаў **упаўнаважаны Прэзідэнта па Гомельскай вобласці, намеснік Прэм'ер-міністра Анатоль СІВАК.** Ён падкрэсліў, што ў дзяржавы ёсць пэўныя абавязацельствы, прадугледжаныя ў тым ліку законам аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на ЧАЭС і іншых радыяцыйных аварый. Яны будуць выконвацца. У той жа час, звярнуў увагу Анатоль Сівак, трэба пераглядзець і прааналізаваць пытанні аднясення тэрыторый да катэгорыі пацярпелых. «Неабходна аналітычная работа, пэўныя акцэнты... Гэту работу неабходна рабіць, гэта даручэнне Прэзідэнта, каб ацэньваць, а не заставацца ў лічбах, якія былі 39 гадоў таму. Аналітыка не павінна заставацца нязменнай», — адзначыў ён. Віцэ-прэм'ер падкрэсліў, што дзяржавай шмат зроблена для стварэння сацыяльнай інфраструктуры, сацыяльнай падтрымкі не толькі ў чарнобыльскіх рэгіёнах, але і ў цэлым па краіне, у адпаведнасці з рознымі рэспубліканскімі праграмамі. «Але калі мы гаворым, што тут патрэбны нейкія дадатковыя грошы, то яны павінны быць вельмі якасна пралічаны, аргументаваны і накіраваны на вырашэнне канкрэтнай праблемы. У першую чаргу гэта праблемы, звязаныя з вытворчасцю там, дзе адбіваецца ўплыў чарнобыльскага фактару. І тут патрэбна адпаведная падтрымка», — растлумачыў ён. Ключавымі прынцыпамі для аказання такой падтрымкі, па яго словах, з'яўляюцца канцэнтрацыя, дысцыпліна, эфектыўнасць.

**Старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО** падкрэсліў, што прынятыя чарнобыльскія праграмы далі станоўчы эфект. Першыя чатыры з іх канцэнтраваліся на ахове здароўя чалавека, стварэнні ўмоў для будучай рэабілітацыі забруджаных тэрыторый. Пятая і шостая праграмы накіраваны на развіццё саміх пацярпелых рэгіёнаў, гэта значыць на стварэнне вытворчасцяў. Па словах Івана Крупко, у вобласці пабудаваны 4 малочнатаварныя комплексы, 7 зернесушыльных комплексаў, а таксама ўнікальны свінакомплекс. «Цяпер стаіць задача сканцэнтравацца на высокатэхналагічнай вытворчасці ў кожным з найбольш пацярпелых раёнаў і ў цэлым па Гомельскай вобласці. У далейшым — гэта эканоміка, стварэнне вытворчасцяў на гэтых тэрыторыях. Дакладна па кожным раёне яны адрацаваны, і Гомельскім аблвыканкамам унесены прапановы на ўзровень урада», — расказаў губернатар.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Міхаіл РУСЫ** — упаўнаважаны Прэзідэнта па Брэсцкай вобласці. Гэты рэгіён таксама адносіцца да пацярпелых ад наступстваў аварыі на ЧАЭС. Ён заўважыў, што на Брэстчыне ўжо зроблена вельмі шмат, але можна зрабіць больш і даць лепшы вынік. Асноўныя кірункі застануцца незменнымі — стварэнне камфортных умоў для жыцця людзей, праўдзенне меліярацыі. Па словах Міхаіла Русага, у гэтых рэгіёнаў вялікія перспектывы для развіцця.

# «КАЛІ Ў НАС ХТОСЬЦІ БАІЦЦА ЗАМЕЖНІКАЎ, ТРЭБА ПРАЦАВАЦЬ ТАДЫ ЗА ТРАІХ»

Прэзідэнт, як заўсёды, у курсе таго, што хвалюе або можа занепакоіць грамадзян краіны. Таму кіраўнік дзяржавы палічыў патрэбным адрэагаваць на тэму, якая апошнім часам вельмі актыўна абмяркоўваецца ў інтэрнэце, — запрашэнне пакістанскіх спецыялістаў на работу ў Беларусі. Адпаведныя дамоўленасці былі дасягнуты падчас перагавораў Прэзідэнта Беларусі з прэм'ер-міністрам Пакістана Шахбазам Шарыфам, падчас яго афіцыйнага візіту ў Мінск. Такім чынам, каментарый з самых першых вуснаў.

«Натуральна, як Еўрапейскі саюз, Расія, так і нам у найбліжэйшай будучыні давядзецца пагадзіцца на тое, што ў нас будуць працаваць людзі з іншых краін. І перш за ўсё з краін азіяцкіх», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. І асабліва падкрэсліў, што на перагаворах з пакістанскай дэлегацыяй была дасягнута дамоўленасць аб тым, што бакі выпрацуюць пэўную праграму, якая будзе зацверджана міжурадавым пагадненнем.

**«Гэта значыць, трэба выпрацаваць механізм, каб не адбылося так, як нас і наш народ сёння спрабуюць палохаць. Толькі чаго палохаць?» — адзначыў Прэзідэнт. Ён заўважыў, што цудоўна ведае аб тым, што ёсць людзі вельмі зацікаўленыя ў тым, каб узрушыць наша грамадства. «Я магу вам па-народнаму сказаць, непапулярна: калі ў нас хтосьці баіцца замежнікаў, трэба працаваць тады за траіх. Трэба працаваць хоць бы за дваіх, як у Еўрапейскім саюзе. І мы найбліжэйшыя 10—15 гадоў увогуле не будзем гаварыць пра дэфіцыт працоўных рэсурсаў. Проста нам трэба больш працаваць. Хочам мы гэтага? Не вельмі», — шчыра выказаўся кіраўнік дзяржавы.**

Ён таксама заўважыў, што для таго, каб не мець праблем з працоўнымі рэсурсамі, трэба павышаць дэмаграфію. Але далёка не ўсе хочуць нараджаць па траіх і больш дзяцей, нягледзячы на вялікую дзяржаўную падтрымку.

На дадзены момант у Беларусь прыехала ўсяго каля двух дзясяткаў пакістанцаў. «Яны што, дэстабілізавалі абстаноўку? Не. Пацікавіўся, як працуюць? Ніякіх пытанняў няма. Скажуць — зробяць усё сапраўды добрасумленна, таму што яны сербанулі гора», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што запрашэнне пакістанскіх спецыялістаў вельмі выгаднае для нашай краіны. І растлумачыў на прыкладзе Баранавіцкай баваўнянай фабрыкі. У Пакістане надзвычай добра развіта тэкстыльная прамысловасць, таму карысным будзе і абмен досведам. Акрамя таго, пакістанскія партнёры гатовы пастаўляць сыравіну — бавоўну, якой у нас, як вядома, няма. «Я кажу: дык з задавальненнем — мы створым усе ўмовы, нават жыллё пабудуем, калі вы дасце нам сыравіну і тых спецыялістаў, якія там патрэбныя. І будзем разам працаваць, — адзначыў беларускі лідар. — Як прынята ў народзе, "баш на баш": мы табе гэта пастаўляем — ты купляеш — мы табе тут дапамагаем. І шмат іншых пытанняў. Вось у чым сутнасць тых перагавораў. Гэта ў інтарэсах нашай дзяржавы».

«Вы што, лічыце, я хачу зрабіць для Беларусі горш? Ды не.

**Мы кожную сям'ю, кожнага чалавека (што адбываецца і цяпер, пакуль мы не прынялі рашэнне), мы кожнага прасвечваем на рэнтген. І ніхто не настойвае браць, не браць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.**

Ён таксама звярнуў увагу, што поўную адказнасць за мігрантаў нясе кіраўнік прадпрыемства, які прымае іх на работу. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што для развіцця краіны, яе росквіту патрэбны працоўныя рэсурсы. І пры гэтым у нас павінен быць парадак, таму на работу ў Беларусь будуць запрашацца толькі тыя, хто гатовы і будзе тут працаваць. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: мігранты з розных краін павінны быць разгрупаваны па тэрыторыі Беларусі. А таксама запрашацца будуць сем'ямі.

«Калі мы хочам захаваць сваю краіну, захаваць наш народ, быць суверэннымі, незалежнымі, будаваць Музей гісторыі беларускай дзяржаўнасці і нашага народа і любавацца, якімі мы былі і колькі стагоддзяў мы жывём, у аснове павінна ляжаць эканоміка. А гэта — людзі. Калі мы хочам працаваць, кіраваць працэсамі, ніякага страху няма, што да нас прыедуць. 3 тысячы чалавек будуць у нас, дапусцім, 60 ці 100 замежнікаў. Гэта нармальная практыка, — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

**— А наогул у нас працоўных рэсурсаў дастаткова. А дзе не хапае, мы «прасвецім» кожнага чалавека і возьмем яго жыць на самай цудоўнай зямлі — беларускай зямлі. З любой краіны. Тых, хто захоча працаваць.**

Аляксандр Лукашэнка асобна звярнуў увагу, што ўсе абмеркаванні ў інтэрнэце гэтай тэмы падаграваюць зацікаўленыя ў тым, каб ускалыхнуць, узрушыць грамадства. Камітэт дзяржбяспекі ўжо выявіў у Брэсцкай вобласці групу такіх людзей.

Сёння ў Беларусі працуюць 85 тысяч спецыялістаў з розных краін. І працуюць добра. А тым, хто хвалюецца за тое, што пакістанцы нібыта перавернуць краіну, Аляксандр Лукашэнка нагадаў:

**«Мы нікому не дазволілі за гэты час і не дазволім пераварочваць краіну. У 2020 годзе тут каля Палаца Незалежнасці не пакістанцы бегалі», — сказаў ён.**

Прэзідэнт звярнуў увагу, што апошнія гады ў Беларусь пераязджае шмат людзей з Украіны. І ніякіх праблем з імі не ўзнікае, працуюць добра, жывуць спакойна. «Чалавек сам па сабе перасяляцца ў іншую краіну не будзе. Гэта ўжо гора прымусіла. Людзі, якія сербанулі гэтага гора, перасяліўшыся кудысьці, атрымаўшы жыллё ды ільготы, якія ёсць у адукацыі, ахове здароўя, — у іх вочы разбягаюцца, яны рады, што прыехалі. І сапраўды, добрасумленна працуюць. І дзеці ў іх будуць такія. Дык чаго мы баімся?» — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

**«Гэта мая праблема. Я буду вырашаць яе так, як будзе выгадна нашым людзям. Найлепшым людзям нашай Беларусі. Я з гэтым заўсёды лічыўся і буду лічыцца», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.**

Прэзідэнт растлумачыў, што закрануў дадзеную тэму менавіта на гэтай нарадзе, таму што праблема працоўных рэсурсаў востра стаіць у Гомельскай вобласці. «Іван Іванавіч, вось вам закон. У любой частцы свету, хоць у Афрыцы, вызначайце людзей, сем'і. Па адным, па два — гэта ваша справа. Глядзіце іх, бярыце на ўлік, давайце ім работу. Выдзеліце ім работу — плаціце заробак, дайце ім зямлю. Яны часта просяць даць кавалак зямлі. У нас гэтага дабра хапае.

**Няхай самі працуюць фермерамі, калі яны хочуць. На тых умовах і паводле тых законаў, якія ў нас сёння існуюць. Крок улева, крок управа ад закона — назад на радзіму», — звярнуўся Прэзідэнт да губернатара Гомельскай вобласці Івана Крупко.**

Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што самае галоўнае — парадак у краіне. Для гэтага трэба выпрацаваць механізм, стварыць самы жорсткі кантроль і запрашаць, браць на работу да сябе тых, хто будзе працаваць.

Гаворачы аб збеглых, якія асабліва хвалююцца па пытанні мігрантаў, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу: «Яны ж нам ужо не дапамогуць. Яны што, пойдуць да Крупко працаваць у сельскую гаспадарку? Ды не, яны там стогнуць. Ім прапанавалі посуд мыць. «Посуд мыць не можам... Гэта не хочам рабіць, вуліцу не хочам падмятаць». Дык а што табе дадуць? Кіраваць Польшчай дадуць? Не, Польшчай кіраваць — ёсць палякі. Яны ў гэтых адносінах моцныя людзі. Таму чаго палезлі туды? Разумнейшымі трэба быць — на сваёй зямлі жыць і працаваць».

# ПРЭЗІДЭНТ АНАНСАВАЎ НАРАДУ З АСНОЎНЫМІ СТРУКТУРАМІ Ў КРАІНЕ

## Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталлю Пяткевіч

Кіраўнік дзяржавы паведаміў, што ў хуткім часе запланаваў правядзенне нарад з асноўнымі структурамі ў краіне — урадам, Нацыянальным банкам, дзе нядаўна памянялася кіраўніцтва, і Адміністрацыяй Прэзідэнта.



«Таму хацеў бы з вамі паразмаўляць на гэту тэму. Якія вы пытанні ўзялі на сябе ў Адміністрацыі Прэзідэнта, якімі пытаннямі займаецеся і як вы ўвогуле бачыце гэту нараду? Я хацеў бы, каб вы ў асноўным заняліся гэтай тэматыкай і гэтай праблемай», — даручыў кіраўнік дзяржавы. Ён заўважыў, што кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта ў курсе справы. «Але толькі чамусьці вы маўчыце — я вам прапанаваў вызначыцца, у які час мы правядзём гэтыя нарады, калі гэта лепш будзе. Таму вы вызначайцеся да гэтай нарады, якія праблемы трэба агучыць Прэзідэнту. Але каб вы разумелі: пасля прэзідэнцкіх выбараў, што ў нас мяняецца, што не мяняецца, у якім кірунку палітычнаму і кадраваму штабу дзейнічаць», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «РАБОТА ТАМ БУДЗЕ НЯПРОСТАЯ»

## Кіраўнік дзяржавы прыняў кадравае рашэнне па паўночным рэгіёне

На «рэгіянальным» тыдні Прэзідэнта адбыліся і кадравыя змены ў рэгіёнах. Аляксандр Лукашэнка ўзгадніў назначэнне Сяргея Ляўковіча першым намеснікам старшыні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта. Вобласць яму ўжо знаёмая — да гэтага Сяргей Ляўковіч працаваў памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Віцебскай вобласці.



«Вы пагадзіліся на гэту няпростую пасаду, я вам удзячны, але там будзе няпростая работа», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Насуперак устаноўленым правілам, Прэзідэнт запрасіў новага першага намесніка губернатара да сябе. «Я адчуваю, і мая паездка ў Віцебскую вобласць, у найлепшыя раёны, сведчыць пра тое, што там вельмі шмат праблем арганізацыйных, — растлумачыў кіраўнік дзяржавы. — Але і вы там працуеце. І вы таксама за гэта несяце адказнасць і ведаеце, што там адбываецца».

Падчас нядаўняй паездкі Аляксандра Лукашэнкі ў Віцебскую вобласць шмат увагі ўдзялілі развіццю аграгарадкоў. Прэзідэнт адзначыў, у аграгарадках краіны зроблена ўжо шмат. Некаторыя з іх — ідэальныя. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што такія пасёлкі гарадскога тыпу, як Копысь, Арэхаўск, якія знаходзяцца ў Віцебскай вобласці, могуць быць узорам, што трэба рабіць у гэтым кірунку. Ён таксама нагадаў, што развіццё раённых цэнтраў паказалі на прыкладзе Шклоўскага раёна. У час сваёй паездкі ў Шклоў Аляксандр Лукашэнка наведаў аграсэрвіс і камбікормавы завод, якія цяпер рэканструююць, будоўлю малакаперапрацоўчага завода. Тады кіраўнік дзяржавы заявіў, што гэта прыклад для ўсіх раённых цэнтраў. І параіў Віцебскай вобласці браць яго са Шклоўскага раёна.

«Усё ўжо адпрацавана. Трэба арганізаваць. Дысцыпліна працоўная ў Віцебскай вобласці няважная. Можа, я памыляюся — вам лепш відаць, вы там працуеце, вы бачыце, што там адбываецца. Але самае галоўнае, што найбліжэйшым часам на нарадзе ў Віцебскай вобласці мы разгледзім, як Віцебшчына спрацавала па апошняй праграме, якую мы зацвярджалі на ўзроўні Прэзідэнта», — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы. Размова ідзе аб праграме, якая прадугледжвае стварэнне інтэграцыйных структур у сельскай гаспадарцы. «Усе кажуць — і моладзь, і старэйшыя людзі, што ідэя нядрэнная, але яна слаба рэалізуецца ў Віцебскай вобласці. Не ўсюды, праўда. Але паўстае пытанне: навошта стваралі, чаму не дацiснулі? Чаму не зрабілі як трэба?» — абазначыў праблему Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што Віцебшчына — вобласць няпростая: «Няпростая ў тым плане, што мы, можа, займаемся там не тым, чым павінны займацца віцябчане. Калі там яны ў лесе, давайце займацца лесаперапрацоўкай у прамысловасці і гэтак далей. Калі ў Віцебскай вобласці цяжка атрымаць збожжавыя, зернебабовыя, дык давайце займацца ялавічынай, давайце малако перапрацоўваць. А ў Оршы, Талачыне — там можна займацца збожжам, там куры, свінні могуць быць, у прынцыпе там так і ёсць. Бракуе дысцыпліны і арганізаванасці. І трэба спыніць усялякія размовы наконт працоўных рэсурсаў. Трэба гэтыя рэсурсы прымусіць працаваць і задзейнічаць. Прымушайце», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Ён звярнуў увагу, што да нас едуць людзі з іншых краін, якія хочуць і гатовы тут працаваць. Аляксандр Лукашэнка параіў персанальна глядзець на кожную сям'ю, кожнага чалавека і, калі ўсё задавальняе, прымаць на работу. «Каб не было крыку, шуму, гвалту, што мы чужых на работу бяром. Не хочаце чужых — працуйце самі. Мы не настойваем, каб прыязджалі з іншых рэспублік іншыя людзі. Але мы без гэтага ў Віцебскай вобласці не абыдземся, таму працоўная міграцыя — гэта нармальна, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Там яшчэ палякі нашых збеглых падбухторваюць. Яны баяцца больш за ўсё, што сюды пакістанцы прыедуць, яны баяцца, што туды пойдуць мігранты дадаткова. Таму палякі, літоўцы няхай супакояцца: ад нас ніякія афганцы, ніякія туркмены, узбекі, таджыкі не з'едуць. Яны будуць у нас жыць і працаваць, каго мы прымем. Таму ім шалець там не трэба і нашых «накручваць», каб яны шум падымалі».

Рэзюмуючы, Прэзідэнт падкрэсліў, што праблем у рэгіёне шмат. Але яны вядомыя Сяргею Ляўковічу. «Я цаню, што вы рашыліся на гэту работу. Патрэбны вынік», — адзначыў ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

### Віцебскія людзі могуць працаваць на зямлі

У размове з журналістамі **першы намеснік старшыні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Сяргей ЛЯЎКОВІЧ** падкрэсліў, што кіраўнік дзяржавы ад Віцебскай вобласці чакае выніку, а дапаможа яго дасягнуць толькі працоўная дысцыпліна і арганізаванасць. Але, паводле яго слоў, ёсць і станоўчы вопыт. У Віцебскай вобласці нямала сельскагаспадарчых арганізацый, якія працуюць на высокім узроўні, паказваюць высокі рэзультат і эканамічную эфектыўнасць. «Гэта сведчанне таго, што віцебскія людзі могуць працаваць на зямлі і дабівацца высокіх вынікаў. Ніякіх звышпаказчыкаў ад нас ніхто не чакае. Але мы павінны працаваць эфектыўна для таго, каб людзі, якія працуюць у сельскай гаспадарцы, атрымлівалі годную заработную плату. На гэта будзе накіравана мая работа перш за ўсё. Пастарацца трэба ўсім. І галоўную ролю ў гэтым будуць адыгрываць кіраўнікі сельскагаспадарчых арганізацый, кіраўнікі перапрацоўчых прадпрыемстваў», — падзяліўся планамі Сяргей Ляўковіч.


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Управление механизации № 91», г. Минск, ул. Бабушкина, 17, пом. 3 |
| **Оператор/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов:**

**Полуприцеп платформа MAZ 5247 d,**
№ кузова 9011, р/з 6793 АА-7, 1990 г. в., инв. № 60061, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 17 (производственная территория).
**Начальная цена лота с НДС 20 % – 24 384,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять)** календарных дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи. Расходы за снятие с учета/регистрации несутся покупателем

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязаны возместить затраты продавцу за проведение независимой оценки и затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **7 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее, чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 02.04.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 08.05.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются: по 07.05.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона**: ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1

**Продавец:** ООО «Гастон Восток», 220114, г. Минск, пр-т Независимости, 165а

| № лот | Предмет аукциона, расположенный по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 165А | Начальная цена без НДС, бел. руб. (снижена на 30 %) | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Легковой автомобиль внедорожник универсал Geely Emgrand X7, г. в. 2015** | 6 440,00 | 322,00 |

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **08.05.2025** в 13.00 по адресу: **г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **07.05.2025** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Шуляк Артур Леонидович, тел. 8029-123-39-49

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by, www.cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** не более 10 (десяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением СовМина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона: **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником, либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** и вознаграждение (8 % от цены продажи (подробная информация в карточке лота на сайте организатора торгов)) на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 28.03.2025 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 44 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

ВЕКАПОМНАЕ

# Наталля КАЧАНАВА: «ЯНЫ СТАЛІ СІМВАЛАМ ВЯЛІКАГА ГЕРАІЗМУ»

## Пад эгідай Савета Рэспублікі і Беларускага саюза жанчын прайшла канферэнцыя, прымеркаваная да 80-годдзя Вялікай Перамогі

Тэма мерапрыемства, якое пачалося на базе 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады і скончылася ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, — «Жаночае аблічча Перамогі». На тэрыторыі воінскай часці ўдзельніцы форуму з усіх рэгіёнаў Беларусі азнаёміліся з побытам жанчын-ваеннаслужачых, у музеі для іх была праведзена экскурсія. Тут жа адбылося і пленарнае пасяджэнне канферэнцыі, на якім абмеркавалі ролю жанчын у Вялікай Перамозе і ў сучасным грамадстве, іх подзвігі на фронце і ў тыле. Завяршылася мерапрыемства цырымоніяй ускладання кветак да стэлы «Мінск — горад-герой».



Фота ТГ-канала Савета Рэспублікі.

### ВАЙНА ВЫПРАБОЎВАЛА З АСАБЛІВАЙ ЖОРСТКАСЦЮ

Адкрываючы пленарнае пасяджэнне, **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** адзначыла: «Жанчын вайна выпрабоўвала на стойкасць з асаблівай жорсткасцю, вырываючы з сэрца самае дарагое — дзяцей, мужоў, бацькоў. Праз 80 гадоў са дня заканчэння Вялікай Айчыннай вайны мы як ніколі ўсведамляем велізарны неацэнны ўклад тых, каго звычайна называюць слабай паловай чалавецтва. Але жыццё не раз даказвала адваротнае. Юныя дзяўчынкі, адважныя мамы і мудрыя бабулі на франтах і ў тыле паказалі ўсяму свету беспрыкладную стойкасць у самыя цяжкія і змрочныя часы. Валодаючы неймавернай сілай духу, яны сталі сімвалам вялікага гераізму і самаахвяравання, якія не ведалі межаў і змянілі ход гісторыі. Іх подзвігі назаўжды ўпісаны ў летапіс».

Спікер нагадала, што на заводах і фабрыках жанчыны ўставалі на месцы мужчын, якія пайшлі на фронт: «Іх далікатныя рукі ператварыліся ў моцныя, рукі, якія ноччу спавівалі немаўлят, а днём адлівалі зброю і боепрыпасы — усё для фронту, усё для Перамогі! Іх працаздольнасць на мяжы чалавечых магчымасцяў стала крытычна важнай. А згуртаванасць, адказнасць і ўзаемападтрымка — краевугольным каменем калектыўнага супрацiву і духу ўсёй нацыі».

Старшыня Савета Рэспублікі заўважыла, што нашы слаўныя беларускі былі падпольшчыцамі і партызанамі, урачамі і медсёстрамі, снайперамі і танкістамі. «Подзвігі Алены Мазанік, Надзеі Траян, Марыі Осіпавай з Мінска, Ганны Маслоўскай, Ефрасінні Зеньковай з Віцебскай вобласці, Зінаіды Партновай і Тацццяны Марыненка з Полацка і многіх-многіх іншых будуць вечна гучаць у нашых сэрцах несмяротнай одай, кожны радок якой напісаны крывёй, слязамі і болем. І ў той жа час верай, надзеяй і любоўю», — сказала спікер.

У гэтым слаўным пантэоне герояў-беларусак — Зінаіда Тусналобава-Марчанка. «Яна — прыклад незвычайнай сілы, чалавечай стойкасці і мужнасці, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Легендарная медсястра выратавала больш за сотню салдат, выносячы на сабе параненых пад лівнем куль і разрываў снарадаў. У адным з баёў сама была цяжка паранена, пазбавілася рук і ног. Нягледзячы на жахлівыя выпрабаванні, яна не зламалася. Адно толькі згадванне яе імя падахвочвала савецкіх воінаў да бясстрашнай барацьбы супраць фашызму, надзяляла іх нязломнай сілай і жаданнем у што б там ні стала адпомсціць».

Спікер падзялілася, што сустрэча яшчэ ў школьныя гады з гэтай гераічнай жанчынай пакінула глыбокі след у яе сэрцы. «Я як сёння памятаю гэту цёплую сустрэчу і яе просьбу — абараніць нашу краіну і каб ніколі не паўтарылася тая трагедыя, якую давялося перажыць нашым старэйшым пакаленням. Гэтыя словы я нясу праз усё сваё жыццё, расказваючы дзецям і ўнукам».

### «ПАКУЛЬ ЛЮДЗІ ШАНУЮЦЬ МІНУЛАЕ, ЧАЛАВЕЦТВА БУДЗЕ РАЗВІВАЦЦА І ЎДАСКАНАЛЬВАЦЦА»

«Дзякуючы нашым бясстрашным землякам, сёння мы маем магчымасць свабодна жыць, гадаваць дзяцей, выхоўваць унукаў, працаваць на карысць роднай Беларусі, ганарыцца і памнажаць яе шматлікія дасягненні і будаваць планы на доўгія гады наперад, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Заплаціўшы за Перамогу цаной мільёнаў жыццяў нашых сыноў і дачок, мы ніколі не забудзем жорсткасць і бясчынствы нацысцкіх катаў і іх памагатых. Ніхто і нідзе ў свеце так самаахвярна не змагаўся з «карычневай чумой». Мы гэта памятаем, і ў гэтым наша сіла, якая дае цвёрдую ўпэўненасць і аб'ядноўвае нас усіх асаблівай місіяй — рабіць усё магчымае і немагчымае, каб гэтыя ахвяры былі недарэмныя. Нам, нашчадкам пераможцаў, завешчана захоўваць памяць аб тых, хто не вярнуўся з вайны. Тых, чыя сіла духу і стойкасць сталі прыкладам барацьбы за свабоду і незалежнасць. І гэта памяць — наша святая рэліквія — будзе перадавацца з пакалення ў пакаленне».

Спікер падкрэсліла, што наш абавязак і маральнае права — не дазволіць абарвацца дыялогу аб каштоўнасці міру, жыцця і свабоды, не паддацца знешняму ўплыву перакапаць нас у адваротным. Ва ўмовах гібрыднай вайны, па словах спікера, мы сталі яшчэ мацнейшымі. Яна заклікала згуртавацца і выступіць адзіным фронтам супраць усіх інфармацыйных укідаў і правакацый. «Як нашы продкі не сталі на калені перад ворагамі, так і мы не маем намеру схіляць галаву перад нашым праціўнікам, — сказала Наталля Качанава. — Каб і надалей супрацьстаяць навалам наймённым намерам «заходніх выскачак» перапісаць гісторыю, мы аб'яднаем намаганні, выкарыстоўваючы ўсе даступныя цывілізаваныя сродкі: ад адукацыйных і культурных праграм, грамадскіх патрыятычных праектаў да навуковых даследаванняў і законадаўчых ініцыятыў».

Рэзюмуючы, Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што сіла праўды — у нашай памяці. «Гістарычная памяць — адна з галоўных багаццяў чалавечай культуры, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Пакуль людзі шануюць мінулае, чалавецтва будзе развівацца і ўдасканальвацца. Памяць вайны заклікае да адказнасці за мір на зямлі. І ў гэтым наша галоўная місія, місія нашчадкаў пераможцаў-герояў без тэрміну даўнасці. Памятаць, каб ніколі не забываць! Памятаць, каб не паўтарылася. Нізкі паклон усім жанчынам, якія ў керзавых ботах і ваенных шынялях набліжалі Перамогу, як маглі... Як могуць гэта рабіць толькі нашы сапраўдныя жанчыны».

**Вераніка КАНЮТА.**

## Дарэчы

**Адзіны дзень прыёму грамадзян членамі Савета Рэспублікі адбудзецца 5 мая ў Брэсцкай вобласці.**

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** правядзе прыём з 11:00 у Жабінкаўскім райвыканкаме (прыём згодна з папярэднім запісам).

***Падрабязны анонс з указаннем адрасоў раённых выканаўчых камітэтаў размешчаны на афіцыйным сайце Савета Рэспублікі.***

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(Организатор аукциона)
по поручению **открытого акционерного общества «Слуцкий сыродельный комбинат» филиала «Здравушка-милк»** (Продавец)
проводит повторный открытый аукцион по продаже:

**Лот № 1:** недвижимое имущество в составе:

• **здание склада с двумя рампами** *(составные части и принадлежности: 3 пристройки, 2 рампы)*, **инв. № 613/С-13723, общей площадью 1728,8 кв. м;**

• **здание склада № 2** *(составные части и принадлежности: подвал, 2 пристройки, 2 схода, дымоходная труба, рампа)*, **инв. № 613/С-13720, общей площадью 1650,8 кв. м.**

• **здание склада № 6** *(составные части и принадлежности: пристройка)*, **инв. № 613/С-13721, общей площадью 304,1 кв. м;**

• **здание склада № 8, инв. № 613/С-13724, общей площадью (протяженностью) 423,2 кв. м;**

• **здание тарного склада, инв. № 613/С-13722, общей площадью 311,6 кв. м;**

• **здание склада строительного, инв. № 613/С-13725, общей площадью 188,9 кв. м.**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623070004601000662, площадью 1,1894 га (право аренды по 06.08.2067), по адресу: Минская область, Крупский район, п. Крупский, ул. Пушкина, 1В.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранные зоны электрических сетей, пл. 0,0119 га; пл. 0,2410 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 97 091,71** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **9 709,00** бел. руб.

**Стоимость снижена на 80 %.**

**Лот № 2:** имущество в составе:

• **производственный корпус (составные части и принадлежности: склад-пристройка, 3 навеса) с инв. № 601/С-13163, общей площадью 4 112,6 кв. м;**

• **административно-бытовой корпус (составные части и принадлежности: пристройка) с инв. № 601/С-13165, общей площадью 880,4 кв. м;**

• **котельная с инв. № 601/С-29361, общей площадью 25,1 кв. м;**

• **контрольно-пропускной пункт с инв. № 601/С-29555, общей площадью 15,9 кв. м;**

• **канализационно-насосная станция с инв. № 601/С-29556, общей площадью 51,8 кв. м;**

• **водонапорная насосная станция с инв. № 601/С-29554, общей площадью 62,7 кв. м;**

• **сети водоснабжения (составные части и принадлежности: 15 участков водопроводной сети, 6 колодцев, 6 трубопроводных арматур, 2 резервуара запаса воды) с инв. № 601/С-30845;**

• **артскважина (составные части и принадлежности: артскважина, фильтр, электропогружной насос, здание артскважины) с инв. № 601/С-30846, общей площадью 9,5 кв. м;**

• **сети канализации (составные части и принадлежности: канализация хозяйственно-бытовая, 5 трубопроводов, 2 колодца, канализация ливневая, 4 трубопровода, 2 колодца, приямок, отстойник) с инв. № 601/С-30847;**

• **оборудование (роллета защитная 2200*2600 с инв. № 020635, роллета защитная 2200*3250 с инв. № 020636, автоматическая система учета электроэнергии (АСКУЭ) с инв. № 00879, котел КВГТ-100 с инв. № 020254, трансформатор 10-1-1У 50/5 с инв. № 00863, трансформатор ТМЗ 630/10-0,4-82У с инв. № 000088, трансформатор ТМЗ 630/10-0,4-82У с инв. № 000089, трансформатор ТОЛ 10-1-1У 50/5 с инв. № 00861, трансформатор ТОЛ 10-1-1У 50/5 с инв. № 00862, трансформатор ТОЛ 10-1-2-0,5СС/5У2 с инв. № 00864, трансформатор ТОЛ 10-1-2-0,5СС/10Р 50/5 У2 с инв. № 00865, трансформатор ТОЛ 10-1-2-0,5СС/10Р 50/5 У2 с инв. № 00866, трансформаторная подстанция 2КТП-630/10/0,4-84-УЗ с инв. № 000078, трансформаторная подстанция 2КТП-630/10/4-84-УЗ с инв. № 000079, градирня ККТ-50 с инв. № 020169, градирня ККТ-50 с инв. № 020170, градирня ККТ-50 с инв. № 020171, градирня ККТ-50 с инв. № 020172).**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623250100001001429, площадью 1,5918 га (право постоянного пользования), по адресу: Минская область, г. Логойск, ул. Я. Купалы, 15.** *Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона р. Гайна, пл. 1,5918 га.*

Часть административно-бытового корпуса находится в аренде (сведения можно получить у организатора аукциона).

Начальная цена с НДС (20 %) **– 1 040 295,19** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены **– 104 029,00** бел. руб.

**Стоимость снижена на 80 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объекты производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона в следующем размере: по лоту № 1 – 4 (четырёх) процентов, по лоту № 2 – 1,5 (полутора) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

